
Рось – гэта “санаторый” Езуса, гэта месца цуду

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
23.08.2015 01:00





8 жніўня дыяцэзіяльны санктуарый Езуса Журботнага ў Росі прыняў шматлікіх пілігрымаў з Гродна, Свіслачы, Шылавічаў, Ваўкавыска, а таксама з іншых месцаў Гродзенскай дыяцэзіі і іншых дыяцэзій Беларусі. Упершыню сёлета была арганізавана пешая пілігрымка Масты–Рось. Найбольш хвалюючым стаў уваход пілігрымаў у санктуарый і хвіліна асабістай малітвы, калі кожны можа даверыць Богу свае справы. Не менш узрушваючым быў і момант, калі перад уваходам у святыню гродзенскія пілігрымы ляглі крыжам на асфальце.

У гэтыя, здаецца, найважнейшыя хвіліны пілігрымавання ў вачах многіх можна было ўбачыць слёзы радасці. У гэтых слязах, нават у хлопцаў, заўважалася вялікае ўзрушэнне. Пасля пройдзеных кіламетраў, пасля цяжкай дарогі і доўгага чакання сустрэчы, Езус Міласэрны з вышыні алтара глядзіць на кожнага пілігрыма, пранікаючы сваім позіркам у душу чалавека... † Вячэрнюю св. Імшу для пілігрымаў узначаліў біскуп Юзаф Станеўскі.

“Мы прыходзім у гэты санктуарый як да крыніцы, каб зачарпнуць чыстай вады, каб узмацніць і адчуць нашу годнасць Божага дзіцяці”, – адзначыў біскуп у гаміліі. Разважаючы над цярпеннем Езуса Хрыста, а таксама над людскім цярпеннем, іерарх дадаў: “З Хрыстом усё мае сэнс, а менавіта момант цярпення, пакуты і смерці”. Паводле слоў біскупа, сэнс пакуты і людскога цярпення варта шукаць у крыжы Хрыста, які з’яўляецца “тварам неспасцігальнай любові Бога да чалавека”.

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
23.08.2015 01:00

Затым пілігрымы выслухалі канферэнцыю, якую да прысутных скіраваў кусташ санктуарыя кс. Чэслаў Паўлюкевіч. Святар заахвоціў вернікаў адкрыцца на Божае дзеянне, каб Святы Дух знайшоў сваё месца ў іх сэрцах і кожны дзень вёў іх дарогай збаўлення.



Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту і акт аддання Найсвяцейшай Панне Марыі завяршылі першы дзень урачыстасцей у санктуарыі.

9 жніўня ўрачыстую святую Імшу для шматлікіх пілігрымаў ўзначаліў ардынарый дыяцэзіі кс. бп Аляксандр Кашкевіч. У Імшы ўдзельнічалі вернікі з розных месцаў дыяцэзіі, частка з якіх прыйшла ў пешых пілігрымках.

Звяртаючыся да пілігрымаў, іерарх адзначыў, што жыццё чалавека – гэта пастаянная пілігрымка. “Праз наша зямное пілігрымаванне нам трэба заслужыць вечнае жыццё”, – дадаў біскуп. Іерарх назваў санктуарый “духоўным санаторыем”, бо тут можна знайсці ўсё, што патрэбна для душы і цела. “Езус Хрыстус з сумным тварам глядзіць сёння на ўсіх нас, якія Яго тут адведваюць, і кажа нам: «Вучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам»”, – сказаў гродзенскі ардынарый.

Біскуп Аляксандр на заканчэнне сёлетніх урачыстасцей у санктуарыі Езуса Журботнага ў Росі адзначыў, што хацеў бы, каб да цудатворнай фігуры Езуса, вядомай сваімі ласкамі ўжо больш за 400 гадоў, скіроўваліся вернікі ў пешых і аўтобусных пілігрымках з усіх парафій дыяцэзіі і з-за мяжы.

“Я прагну, каб сюды пілігрымавала ўся дыяцэзія”, – падкрэсліў гродзенскі ардынарый.

Кусташ санктуарыя кс. Чэслаў Паўлюкевіч падзякаваў усім пілігрымам за прынятую працу пілігрымавання і запэўніў, што дзверы санктуарыя заўсёды адчынены, а таксама заахвоціў наведваць гэтае святое месца часцей.

Апошнім пунктам урачыстасцей стаў канцэрт гурта супольнасці Душпастарства студэнцкай і працуючай моладзі “OPEN” Гродзенскай дыяцэзіі, падчас якога пілігрымы праслаўлялі Бога праз спеў.